ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 117 (499) Аўторак, 18 кастрычніка 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тел. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

10 РЫХТУЕМ КАСТРЫЧНІКАЎСКІ ПАДАРУНАК!

СЁНЬНЯ—ПЯТНАЦЦАТЫ ДЗЕНЬ МІТЫНГУ ЧЫТАЧОЎ ГАЗЭТЫ.

Усе грошы бяспрытульным!

Прамова прадстаўніка газэты „Чырвоная Зьмена“

Таварышы! Мэта суботніка усім вядома: агульнымі сіламі дапамагчы бяспрытульным. Але некаторыя нашы ячэйкі хочуць зрабіць па пагаворцы: «каб воўк быў сыты і авечкі цэлыя», прасьцей кажучы яны імкнуцца адлічыць частку грошай ад суботніка на іншыя патрэбы.

Напрыклад у «Хлебапрадукце» парашылі палову заробку ад суботніку скарыстаць для пакрыцьця выдаткаў па Кастрычнікаўскай вячорцы і толькі палову грошай перавесьці ў фонд бяспрытульных.

На адным заводзе хлапцы дадумаліся ў часе працы організаваць абед і таксама за грошы, вызначаныя для дзяцей і г. д.

Мы лічым вельмі неабходным з усёй рашучасьцю выказацца супроць гэткіх адлічэньняў, ня гледзячы на якія патрэбы іх жадаюць скарыстаць.

Тольгі тады мы зможам нанесьці рашучы ўдар дзіцячай бяспрытульнасьці, калі ўсе да апошняй паўкапейкі, грошы, зробленыя на суботніках, будуць унесены ў гэты фонд.

Інакш мы за двума зайцамі пагонімся і ніводнага ня зловім.

Комсамольская грамадзкасьць, якая ўзьняла пытаньне аб суботніках і якая гэтае пытаньне пачала ажыцьцяўляць, ні ў якім разе не павінна дапушчаць вышэйпрыведзеных «адлікаў».

Калі працаваць на карысьць бяспрытульных, дык працаваць пасапраўднаму, пабальшавіцкаму, ня хістаючыся між бяспрытульнасьцю і рознымі вячоркамі.

Вячоркі і іншыя рэчы—справа ня кепская, але да іх трэба рыхтавацца ў звычайным парадку.

Карацей кажучы:

— Усе суботніцкія грошы цалкам уносьце на бягучы рахунак дзяржаўнага банку № 649.

— Толькі тыя ячэйкі выканаюць цалкам свой абавязак, якія ня толькі добра правядуць суботнік і ўцягнуць усіх дарослых, але якія і цалкам унясуць зробленыя грошы!

Усім прадпрыемствам і ўстановам.

Старшыня мітынгу: У сувязі з прамовай, якую зараз зрабіў прадстаўнік газэты «Чырвоная Зьмена», мы лічым неабходным абвясьціць наступны дакумант:

Згодна пастановы камісіі пры прэзыдыуме ЦВК БССР па організацыі і правядзеньні сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі прапануецца ўсе сродкі, якія зьяўляюцца аплатай комсамольскіх суботнікаў, перавесьці ў Менск на бягучы рахунак дзяржбанку № 649.

Работы, якія будуць праведзены дармова, павінны ацэньвацца асобнымі камісіямі і копіі актаў ацэнак перасылаюцца ў камісію пры прэзыдыуме ЦВК БССР і ў організацыі, праводзячыя суботнікі.

Няпрысылка актаў ацэнак будзе лічыцца, як няўдзел у суботніку.

Старшыня Цэнтральнай Камісіі пры прэзыдыуме ЦВК БССР па організацыі і правядзеньні сьвяткаваньня 10-годзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі

А. Чарвякоў.

З „фронту“ суботніка.

СТАРШЫНЯ МІТЫНГУ! Таварышы! Як мы казалі на папярэднім пасяджэньні для абмену думкамі запісалася яшчэ шмат таварышоў. Прэзыдыум знайшоў неабходным даць выказацца толькі частцы таварышоў, а зьмест прамоў астатніх таварышоў—агаласіць у выглядзе сводкі. Агалашаю гэтыя матар'ялы.

Мястэчка Коханава. Пуста і ціха было раніцай у м-ку Коханава. Дуў васеньні вецярок і над ракой расьсцілаўся туман

У 8 гадзін з розных канцоў паказваюцца старыя яўрэі, сьпяшаючыся ў сынагогу, але моладзі сярод іх ня відаць Моладзь з кошыкамі ў руках сьпяшаецца на суботнік.

Да прызначанага часу сабраліся комсамольцы двух ячэек і пашлі працаваць.

Працавалі ў садзе, здымалі яблыкі.

З ахвотай і стараннасьцю працавалі на суботніку комсамольцы.

Працу скончылі ў 2 гадзіны дню і стройнымі шэрагамі ішлі дамоў.

Глядзелі набожныя старыкі са зьдзіўленьнем на комсамольцаў, якія хоць 20 руб., але зарабілі ў карысьць бяспрытульных.

Талочынскі раён. 2 ячэйкі папрвілі масты і павесілі шыльды „комсамольскі падарунак Кастрычніку“.

Праведзена 6 конфэрэнцый сялянскай моладзі, якімі ахоплена 540-600 асоб.

Організавана праца па рэзцы дроў у мястэчку Талочыне.

Дрыбінскі раён. Каппавіцкая ячэйка на вінзаводзе організавала суботнік, зароблена 16 рублёў.

У 6 сельсаветах Дрыбінскага раёну 10-га праведзены сходы сялянскай моладзі.

Дубровенскі раён 16 кастрычніка адбыўся масавы суботнік на чыгунцы па грузцы баласту; прыняло ўдзел да 600 асоб.

Межаўская ячэйка організавала суботнік па капаньні студняў у якім прымала ўдзел і беспартыйнае насельніцтва.

Ячэйка **Капцэўскага заводу** зарабіла 16 руб. **На суботніку,** акрамя моладзі прымалі ўдзел і дарослыя рабочыя.

У мястэчку Дрыбіне на правядзеньне суботніка папярэдне запісалася больш 300 асоб.

Чаўская ячэйка КСМ праводзіць пабудову маста на шляху, які вядзе да чыгуначнай станцыі.

Вучні **Дукорскай 7-мігадовай** школы ў ліку 280 асоб пашлі капаць бульбу. Зарабілі 74 рублі.

На суботніку харчэўнікаў старшыня цэнтральнага праўленьня профсаюзу будзе працаваць у якасьці повара.

Каўбчанская ячэйка, Клічаўскага раёну працуе на пабудове клюбу.

Горад Шклоў. У горадзе суботнік ужо прайшоў 6-га кастрычніка. У так-званы „судны дзень“ комсамольцы выйшлі з лапатамі працаваць па пабудове стралковага ціру.

Усяго працавала 43 чал.

Дзяўчаты колектыву краўцоў папрацавалі асобна адзін дзень у сябе ў колектыве.

9-га кастрычніка ў нядзелю працавалі на стралковым ціры ячэйкі фабрыкі „Спартак“ і вучні сямёхгодкі.

Ячэйка фабрыкі „Барацьба“ будзе працаваць на выгрузцы 30 вагонаў баласту.

Паводлуг умовы з адміністрацыяй фабрыкі „Спартак“, фабрычная ячэйка будзе працаваць на карысьць бяспрытульных яшчэ ў нядзелю.

Першы заробак—45 рублёў.

(Прамова сакратара яч. Менскіх харчавых заводаў т. Галкіна)

Наша ячэйка дагаварылася з адміністрацыяй харчавых заводаў наконт работы на комсамольскім суботніку. На заводах „Беларусь“ і „Пролетары“ організованы спэцыяльныя тройкі.

Працаваць на суботніку наша моладзь будзе ня ўся разам, а кожны ў свой выхадны дзень.

Да гэтага тэрміну ўжо працавала 22 чалавекі. Першы заробак 45 рублёў.

Беспартыйная работніца тав. Дорская і падростак Котлер таксама аддалі свой дзенны заробак на карысьць бяспрытульных.

Усяго на нашым суботніку будзе занята звыш 60 чалавек, заробім каля 140 рублёў. Суботнік закончым да 25 кастрычніка.

300 рублёў даюць гарбары.

Прамова-ўражаньні т. Газэтнага.


8 гадзін раніцы...

Ляхаўка. Кіпіць ужо заводзкае жыцьцё.

На Ляхаўцы сёньня не адчуваецца той сьвяточнасьці, якая звычайна бывае па нядзелях. Усюды, у поўным разпале ідзе комсамольскі суботнік.

Вось **скураны завод.** 130 чалавек рабочых заводу ўжо даўно парушылі ранішнюю цішыню.

На дварах група рабочых зьбірае



дошкі, складвае іх у парадку. Вось гурбою нясуць вялізарны шкап, ставяць бокам, каб ен пралез у памяшканьне заводу. Энэргічны пад'ём і з шкафам пакончылі.

Тут сярод усіх рабочых заўважваеш і комсамольскіх актывістых, Галавач, работнікі Ляхаўскага райкому... Іх запрасіла комсамольская ячэйка скурзаводу і яны зьявіліся ў час, разам з усімі рабочымі.

А там за заводам ачышчаюць шлях. Над урэзаўшыміся ў зямлю вострымі рыдлеўкамі зараз зьвернута дзесяткі вачэй схіліўшыхся галоў удзельнікаў суботніку. Сьмецьце і кара, пакрыўшыя за доўгі час тоўстым пластам двор заводу, зараз скідаюцца ў кучу і адвозяцца далёка за межы заводу.

— Да праўды дакапаемся, падняўшы сваю лысую галаву, кажа **майстар Бжажынскі** (с «правдой»—Бжажынскі называе самую глыбіню зямлі).

А вось і другі старычок майстар **Ільлінскі**

Афраймовіч, беспартыйны рабочы скурзаводу кажа: калі будзе патрэбна—я гатоў папрацаваць і некалькі суботнікаў.

Работа кіпела ня толькі на двары, але і ў цэхах. Ажылі 1-ы і 3-ці скурзаводы, 10 фабзавучнікаў праводзілі суботнік на сваім заводзе.

1400 выробленых апоек—вось што далі 25 рабочых працаваўшых на суботніку па сваёй спэцыяльнасьці.

Усяго ў гэтую нядзелю працавала на скураных заводах 130 чалавек, з іх 80 комсамольцаў і астатнія—беспартыйныя рабочыя. Сярод комсамольцаў не знайшлося ніводнага «дэзэртыра» ці гультая.

Праўда, былі і маленькія недахопы на суботніку: некаторыя хлапцы зьявіліся на работу ў сьвятошнай вопратцы, спачатку не хапала патрэбнай колькасьці рыдлёвак.

Але ў агульным суботнік прайшоў вельмі весела і дружна. На карысьць бяспрытульных гарбары аддалі каля 300 рублёў.

На саўхоскіх палёх.

Прамова - уражаньні ўдзельніка Міхасёва.

Ад гораду да Людаманту, саўхозу імя Лекерта,—усяго вярсты дзьве. Мінаючы пыльныя вуліцы Менску і тут недалёчка ад гораду ўдыхаеш крыху вольней. Вузенькая дарога вядзе нас у двор саўхозу.

Яшчэ здалёку заўважваеш на полі шматлікія, радасныя твары хлапцоў, чырвоныя хусточкі і ўрачысты выраз на тварах дзяўчат.

Поле кішыць... Суботнік у поўным разгары.

Яны, студэнты Менскага гідратэхнікуму, доўга рыхтаваліся да гэтага ўрачыстага моманту. Падштурхоўвалі партыйную ячэйку пры Наркамземе. Шмат чым дапамог сябра ЦП саюзу працаўнікоў зямлі і лесу тав. Слухоўскі.

Урэшце, знайшлі для сябе работу.

Але гэтага яшчэ было мала. Трэ' было ўцягнуць у суботнік і беспартыйных студэнтаў. Правялі „індывідуальную апрацоўку“ кожнага з іх, у выніку чаго з 60 студэнтаў тэхнікуму на суботнік зьявіліся 51, сярод іх—17 чалавек беспартыйных.

Яшчэ ня было і 8 гадзін раньня, калі вясёлыя шэрагі гідратэхнікумцаў высыпалі на поле. Хацелася хутчэй узяцца за работу, пачаць свой суботнік. Але на гэты раз падвяло надвор'е. Пакуль халодныя прамяньні кастрычнікаўскага сонца разьмякчылі замёрзшае за ноч поле, братве прышлося пастаяць без работы каля 2-х гадзін.

Затое, з якой ахвотай яны ўзяліся за работу!

Градкі былі хутка імі ачышчаны, буракі і моркву выцягнулі з халоднай, сырой зямлі. Працавалі энэргічна, аж пот, нягледзячы на холад, выступіў на іх тварах.

Потым гэтыя сырыя прадукты ачысьцілі і зьвезьлі. Суботнік закончылі з надзвычайна вясёлым настроем. Гідратэхнікум таксама ўнёс сваю „лепту“ ў агульную справу. Выручылі ад суботніка каля 35 рублёў.

У суботніку ўдзельнічалі і 3 комсамольцы мясцовай, саўхоскай ячэйкі.

* * *

Працавалі на суботніку і ў суседнім, імя Розы Люксэмбург саўхозе. Менскія спэцклясы ўжо другую па ліку нядзелю ахвяроўваюць бяспрытульным.

На мінулым тыдні працавала 16 чалавек, прыбралі каля дзесяціны бульбы. Зарабілі нямнога—па рублю на чалавека.

Сёньня-ж на суботнік зьявіўся 41 чалавек—27 комсамольцаў і 14 беспартыйных. Мясцовы комсамолец Радзевіч працуе на карысьць бяспрытульных ужо другую нядзелю.

— Трэба дапамагчы—кажа ён, гэта абавязак комсамольскі.

Кіраўнічы саўхозам т. Ліндэ усялякім чынам садзейнічаў правядзеньню суботніку, ён нават абяцае работу і на другую нядзелю.

— Малайцы будзем—на гэтай рабоце можна будзе скарыстаць 10 чалавек, толькі здаровых хлапцоў адбірайце—напамінае нам кіраўнічы саўхозам. Некалькі чалавек можна будзе паслаць на работу па шаткаваньне капусты.

За дзень жа 16 кастрычніка вучні спэцклясаў пасьпелі зрабіць на суботніку вось што выбралі $1^1/_2$ дзесяціны буракоў. $1^1/_2$ дзесяціны бульбы, засыпалі капцы і зьнялі 50 пудоў яблык.

Нечага адмаўляць, к канцу суботніка некаторыя хлапцы ня зусім старанна працавалі. Адзін нават ухітрыўся пазаймацца фізкультурай на дрэвах, паасобныя парачкі ішлі ў алешнік і адтуль „любаваліся прыродай“ думаючы, што і гэтым яны дапамагаюць бяспрытульным.

Але, у агульным праца кіпела. Дзяўчаты, што былі заняты на полі капаньнем бульбы не прапушчалі ніводнага „гультая“.

Усім трэба працаваць— крычалі яны. І той хто толькі праходзіў каля гэтага поля, прымушаны быў застацца там працаваць.

* * *

Урэшце неабходна паказаць на галоўны недахоп у правядзеньні суботніка ў абодвух саўхозах.

На суботніках мы бачылі амаль што адных толькі вучняў.

З мясцовых комсамольцаў працавалі адзінкі Менску.

Комсамольская ячэйка саўхозаў зусім ніякай падрыхтоўчай працы да суботніка не праводзіла і саўхоскія рабочыя нават ня ўцямілі сабе значэньня гэтага суботніка.

Працаваў увесь завод

(Прамова сакратара ячэйкі шкляной гуты „Пролетары“ т. Пятровіча).

Таварышы!

Наша ячэйка правяла вялікую падрыхтоўчую работу. Дзякуючы гэтаму на суботніку працавалі ўсе рабочыя заводу ў 3 зьмены. Працавалі кожны па сваёй спэцыяльнасьці, у сваім цэху.

У суботу з 12 гадзін ночы загукаў заводзкі гудок і ўсе рабочыя зьявіліся на суботнік.

Мы лічым, што гэтая работа дасьць на карысьць бяспрытульных каля паўтысячы рублёў.

Акрамя гэтага, у суботу з 2-х гадзін дню мы былі заняты на «чорнай» некваліфікаванай рабоце. Напоўнілі ванную печ шклом, за што адміністрацыя нам заплаціла 50 рублёў.

На гэтай рабоце мы скарысталі і 25 чырвонаармейцаў з сатаварыскай вайсковай часткі ДПУ. Прышлі і беспартыйныя рабочыя, сярод іх—майстар шклодувальнага цэху т. ГАРБАЧОЎ, які кіраваў усёй работай на «суботніку».

Трэба адзначыць, што прапанову аб узяцьці гэтага заданьня для «суботніка» высунуў беспартыйны рабочы т. ВАСІЛЕЦ.

Друкары далі 113 рублёў.

(Прамова-ўражаньні ўдзельніка тав. Сібіракова).

А 8-й гадзіне раніцы высьвятлілася, што на суботнік не зьявілася толькі пяць вучняў, ды і тыя беспартыйныя. А ўсе комсамольцы **профшколы друкароў** на месцы. Зьявіліся і 23 беспартыйныя вучні і дарослыя інструктары. Уся адміністрацыя таксама ў школе—за працай.

Весела прыняліся за працу. Суботнік ня лёгка даўся профшколе. Было ня мала перашкод. Так, 1-ая дзярждрукарня, адкуль профшкола бярэ электрычную энэргію, адмовілася даць у нядзелю ток.

Зарабілі за гэты дзень друкары 113 рублёў.

Можна было-б правесьці лепей.

На заводзе „Мэталь“.

(Прамова сакратара ячэйкі тав. Мая).

У нядзелю 16 кастрычніка быў праведзены суботнік і на нашым заводзе. З 34 комсамольцаў ячэйкі зьявілася 30 і 8 дарослых рабочых. 3 ліцейшчыкі і 4 сталяры працавалі па сваёй спэцыяльнасьці. Астатнія грузілі катлы і праводзілі вучот матар'ялу.


Таксама ўдзельнічалі ў суботніку старэйшы майстар заводу т. Кудзіновіч і кладаўшчык т. Уланцаў. Зарабілі каля 70 рублёў.

Усё-ж трэба адзначыць, што суботнік на «Мэталі» прайшоў неяк сумнавата. Пры належнай падрыхтоўчай працы з 150 рабочых заводу згадзіліся-б прыняць удзел у суботніку куды больш рабочых.

СПРАВЫ і ДНІ АДНАГО ПРАДПРЫЕМСТВА

АГЛЯД АБУТКАВАЙ ФАБРЫКІ





БЫТ КОМСАМОЛЬЦАЎ І МОЛАДЗІ.

ПЫТАНЬНЕ ГЭТА УЖО ЧАСТКОВА ВЫЦЯГНУТА НА ГАЗЭТНЫЯ СТАРОНКІ, АЛЕ ЗАКРАНУТА ЎСЕ-Ж-ТАКІ НЕДАСТАТКОВА. ЮНКОРЫ „ПАДКАЧАЛІ“.

Рэдакцыя адводзіць месца для бытавых пытаньняў яшчэ і ў другім нумары. Юнкоры павінны ведаць, чым і як жыве кожны комсамолец, кожны малады рабочы і работніца фабрыкі і напісаць аб гэтым да наступнага нумару газэты.

ЧАРГОВАЕ ПЫТАНЬНЕ НАШАГА АГЛЯДУ—ЯК ПРАЦУЕ КОМСАМОЛЬСКАЯ ЯЧЭЙКА. ЧАКАЕМ МАТАР'ЯЛАЎ.

Агляд сябе апраўдае — так кажуць рабочыя фабрыкі.

Раней рабочыя нашай фабрыкі сумняваліся ў тым, ці атрымаецца што-небудзь карыснае з агляду, які пачынала рэдакцыя «Чырвонай Зьмены».

— Ці-ж гэта справа комсамольскай газэты?—гаварылі яны. Усё роўна ў іх нічога ня выйдзе, дарма толькі грошы страцяць.

Але хоць і сумняваліся рабочыя, а матар'ялы ў газэту давалі.

Калі-ж павесілі аб'яву аб скліканьні пасяджэньня вытворчай камісіі, на якое запрашаюцца і рабочыя, высунуўшыя тую ці іншую прапанову, — яны пачалі казаць:

— Відно, што агляд дасьць добрыя вынікі, бо рэдакцыя настайвае, каб высунутыя рабочымі карысныя прапановы былі праведзены ў жыцьцё.

А калі пасьля гэтага пасяджэньня пачалі рабіць да фрэйзеровачнай машыны вэнціллятар, а пасьля нарады майстраў з вучнямі—палепшылася абучэньне броні, рабочыя з упэўненасьцю заяўляюць, што агляд—справа добрая і карысьць ад яго будзе вялікая.

Міхась.

Бася--прыклад для моладзі.

Комсамолка **Баброва** Бася жыве ў сям'і з бацькам, маткай, двума маленькімі братамі і сястрой.

Яна—самая старшая сярод дзяцей сваіх бацькоў, і гэта адчуваецца ў сям'і, якой яна аддае ўвесь свой заробак.

— Матка Басі—хворая. У ле—рэўматызм суставаў. Бася шмат стараньняў прыклала для таго, каб дастаць неабходны для хворых ног абутак.

Яна заўсёды стараецца ўрваць час, каб дапамагчы матцы ў яе рабоце.

Не забывае Бася і малодшых сясьцёр і брата—наколькі можа, **дапамагае ім вучыцца.**

Чым і як толькі можа, дапамагае дзяўчына бацьком, і ў той-жа час—**працуе над** сабой. Цяпер яна накіравана на вучобу ў савпартшколу.

Бася вельмі цікавіцца грамадзкім жыцьцём фабрыкі. Яна задумваецца над усімі пытаньнямі фабрычнага жыцьця, а ўсяго працуе на ёй (фабрыцы) з лета 1927 году, гэта значыць—пасьля сканчэньня прафшколы абутнікаў, дзе яна **была сакратаром ячэйкі КСМ.**

Клапаціцца і, чым можа, дапамагае Бася і сваім таварышом па прафшколе.

Напрыклад, адну сваю тазарышку яна **памясьціла была ў сябе дома і дапамагла ёй знайсьці работу.**



Баброва Бася

Баброва таксама хварэе душою за тое, што некаторыя з скончыўшых прафшколу знаходзяцца на малакваліфікаванай працы.

Актыўная ў грамадзкай рабоце, клапатлівая да сям'і і таварышоў, Бася можна быць прыкладам для нашай моладзі.

Комсамолец.

Галярэя п'яніц.

Нягледзячы на тое, што сёлета на адчыненым сходзе ячэйкі ўрачом быў зроблены даклад аб шкоднасьці алкоголю і былі прыняты адпаведныя пастановы,—п'янства не паменшылася ні сярод моладзі, ні сярод комсамольцаў.

Ёсьць у нас вядомы кадр хлапцоў, які выпівае сыстэматычна, «плянава», што вельмі дрэнна адбіваецца на вытворчасьці.

Вось гэты «кадр» я і хачу паказаць усёй комсамольскай Беларусі.

Тав. **Грынкевіч**—пачынае піць у суботу і калчае ў нядзелю, а ў панядзелак, працуючы ля машыны з хвораю галавою, **вырабляе менш, чымся ў іншыя дні.**

Недалёка ад першага стаіць і т. **Баброўскі**, які хлябнуўшы звыш «нормы», буяніць па вуліцах і **прыходзіць дамоў з пабітаю галавою.**

Тав. **Санчук** таксама «не качае», а трэба памятаць, што яму ўсяго 17 год і п'янка асабліва дрэнна адбіваецца на яго здароўі.

Былы комсамолец тав. **Мішкін**, добра «набраўшыся» ў піўной, бярэ з сабою некалькі дарослых рабочых, вядзе іх на кватэру і там пачынае ізноў—да ўпаду.

А т. **Гарэлік**, які яшчэ нядаўна лічыўся комсамольцам, выпівае толькі з дарослымі рабочымі—хоча атрымаць па гэтай галіне добрую практыку.

Не адстаюць ад гэтай кампаніі і некаторыя комсамольцы.



Дружакі

Тав. **Л-ц** да «сваёй» дзяўчыны прыходзіць амаль заўсёды п'яным; у школе таксама быў некалькі разоў падпіўшы.

Тав. **Ш-н** хоць і скараціў свае выдаткі па частцы розных напіткаў на 20 проц., але яшчэ і цяпер лічыцца п'яніцам.

Комсамольскай ячэйцы трэба папершае, ужыць усе захады да таго, каб моладзь уцяміла шкоднасьць алкоголю, падругое, разгарнуць культурна-масавую работу, організаваць адпачынак моладзі, тады мы зможам выжываць з яе шэрагаў гэтую хваробу—алкаголь.

СВАЯ.

Чутны „бацька“ і „матка“.

Асноўная хвароба як моладзі, паогул, так і комсамольцаў нашай фабрыкі ў тым, што паміж імі адсутнічаюць таварыскія адносіны.

Яскравым прыкладам гэтага могуць быць таварышы Баскін і Гарэлік, аб якіх ужо пісалася.

Надта распаўсюджана сярод хлапцоў і лаянка, асабліва ў часы абедзеннага перапынку, калі ва ўсіх кутках чутны і «бацька» і «матка».

Некаторыя да майстраў, нават і тых, якія добра абучаюць,—адносяцца дрэнна. Гэта падцьвярджаецца словамі вучня Баброўскага, які абазваў свайго майстра сабакаю.

Комсамольскай ячэйцы на гэткія зьявішчы трэба зьвярнуць сваю ўвагу і пакласьці ім канец.

Фэйгель.

Сёньня дзевяты дзень агляду

У часе перапынку, за абедам.

(Малюнкі).

У 12 гадзін дню фабрычны гудок абвяшчае аб абедзенным перапынку.

Частка рабочых уходзіць абедаць у сталоўку МЦРК, астатнія «шамаюць» на самай фабрыцы.

... Хутка напаўняецца пакойчык фабрычнай сталоўкі, надта цесны, ды і ня зусім чысты.

Поўна і ў залі клюбу, у пакоі ленінскага кутку, і апэтыту рабочых не перашкаджае тое, што столік завалены пабітымі шыбамі, што ў пакоі ня зусім цёпла.

Вось, малады рабочы Мішкін выцягнуўся на сцэне клюбу і ў такім становішчы праводзіць абед.

Дзяўчынка-бронь-вучаніца чытае даросламу рабочаму газэту адклікаюць Ракоўскага, французскі ўрад настайвае на гэтым.

Чытаюць і астатнія рабочыя, абменьваюцца думкамі наконт прачытанага.

...А першай гадзіне «сталоўка» пусьцее. Гудок кліча на работу.

З абедзенным харчаваньнем рабочых справа абстаіць ня зусім добра: брудна ў памяшканьні не хапае чашак для кіпятку, не хапае і сталоў.

Адміністрацыі заводу і завкому трэба задумацца над зьнішчэньнем гэтых недахопаў.

Пралетарскі.

Міжнародны агляд.

Дзень за днём.

Савецкі ўрад адклікае т. Ракоўскага.—Францыя ідзе па шляху ангельскіх консэрватараў.—Комсамол Нямеччыны на баявым пасту.—У працоўных агульная барацьба, адзіны вораг.

Пагроза справе міру.

Абгаварваньне пытаньня аб далейшым прабываньні тав. Ракоўскага ў Францыі формальна закончана.

Савецкі ўрад, ня гледзячы на беспадстаўнае патрабаваньне аб адкліканьні нашага паўнамоцнага прадстаўніка, прымушаны вызваліць т. Ракоўскага ад абавязкаў пасла ва Францыі.

Мы шмат разоў падкрэсьлівалі і цяпер падкрэсьліваем, што сутнасьць абвінавачваньняў супроць т. Ракоўскага зусім беспадстаўна.

Прад'яўленьне абвінавачваньняў сьведчыць толькі аб неабходнасьці прыкрыць пры іх дапамозе наяўнасьць шырокага наступленьня супроць СССР.

Таксама і супроць мажлівасьці ўрэгуляваньня франка-савецкіх адносін.

Праўда, згодна «міжнародных звычаяў» кожны ўрад мае права патрабаваць адкліканьня таго ці іншага замежнага пасла.

Але што азначае сабою адкліканьне т. Ракоўскага?

Раней за ўсё гэта азначае тое, што французскі ўрад пайшоў па шляху ангельскіх консэрватараў.

Гэта азначае, што французскі ўрад зрабіў уступку буйной буржуазіі.

У працягу некалькіх тыдняў французскія рэакцыйныя газэты, з пенай ля роту, даказвалі неабходнасьць разрыву з Савецкім Саюзам.

Выступаючы супроць т. Ракоўскага, яны тым самым імкнуліся разбурыць франка-савецкую згоду.

У пісьмовым звароце т. Чычэрына падкрэсьліваецца, што «намаганьням энэргіі т. Ракоўскага франка-савецкая конфэрэнцыя ў значнай меры абавязана дасягнутымі вынікамі».

Гэтымі словамі савецкі ўрад сьцьвярджае, што выконваючы яго дырэктыву, савецкі пасол на працягу двух гадоў бязупынна працаваў над справаю франка-савецкага зблізкэньня.

Ці адкідае гэтае сьцьвярджэньне французскі ўрад?

Мы лічым патрэбным адзначыць, што ні ў адным дакуманце французскі ўрад не адважыўся адмаўляць ролі т. Ракоўскага ў справе франка-савецкага збліжэньня.

Калі-ж урад Францыі палічыў мажлівым дамагацца адстаўкі чалавека, які многа зрабіў у пытаньні збліжэньня абедзьвюх краін, дык падобная тактыка выкліча сур'ёзную небясьпеку **наконт далейшага лёсу** ўсёй гэтай справы.

Наш друк досыць поўна ўскрыў усю ўнутраную мэханіку, якая штурханула французскі ўрад на гэты крок.

Прабываньне ў Парыжы Чэмбэрлэна, Чэрчыля і Дэтэрдынга азначае ўсебаковы націск на Францыю з боку ангельскай дыплёматыі, фінансаў і нафты.

Калі французскі ўрад хацеў наладзіць з намі добрыя політычныя адносіны, ён вуснамі сваіх прадстаўнікоў урачыста заначаў, што інтарэсы Францыі і СССР нідзе ня маюць сутычкі і што ніхто ня можа папкодзіць добрым адносінам між дзьвюма краінамі.

Бліжэйшае будучае пакажа, ці зможа французскі ўрад трымацца на гэтай позіцыі.



Комсамол Нямеччыны на баявым пасту.

Тыдзень таму назад, у Бэрліне (сталіца Нямеччыны) адбылася конфэрэнцыя комуністычнага саюзу моладзі.

На абвестцы дню сталі самыя баявыя пытаньні.

Першае з іх—**барацьба комуністычнага саюзу моладзі за абарону Савецкага Саюзу**, і другое—**бліжэйшыя задачы комсамолу.**

На першым пытаньні дакладчыкам выступаў прадстаўнік выканкому КІМ'у.

Пасьля шырокіх спрэчак па пытаньні аб пагрозе вайны і аб опозіцыі ва УсеКП(б), была аднагалосна ўхвалена рэзолюцыя, у якой гаворыцца: «Агульнанямецкая конфэрэнцыя комуністычнага саюзу моладзі цалкам і поўнасьцю згаджаецца з пастановай пленумаў Выканкому Комінтэрну і КІМ'у.

Абодва пленумы высунулі ў якасьці асноўнай задачы ўсіх комуністычных партый і саюзаў моладзі—барацьбу супроць імпэрыялістычнай вайны, небясьпекі абароны Савецкага Саюзу і кітайскай рэволюцыі.

Па пытаньнях аб опозіцыі рэзолюцыя зазначае:

«Конфэрэнцыя вітае аднагалоснае рашэньне аб выключэньні Троцкага і Вуйовіча з Выканкому Комінтэрну.

Конфэрэнцыя поўнасьцю даверае бальшавіцкаму кіраўніцтву УсеКП(б) і Комінтэрну і ўпэўнена, што супроцьпартыйныя выступленьні опозіцыі разаб'юцца аб адзінства і згуртаванасьць шэрагаў УсеКП(б) і Комінтэрну».

Па пытаньні аб бліжэйшых задачах комуністычнага союзу моладзі дакладваў сакратар саюзу Блэнкле.

Ухваленая па дакладзе рэзолюцыя падрабязна адзначае задачы, якія стаяць перад комсамолам. «У Нямеччыне,—гаворыцца ў рэзолюцыі,—барацьба супроць ураду буржуазнага блёку цесна зьвязана з барацьбой супроць вайны.

Рэакцыйныя мерапрыемствы ўраду служаць справе падрыхтоўкі імпэрыялістычнай вайны.

Сацыял-дэмократы падтрымліваюць сваёй здрадніцкай політыкай падрыхтоўку вайны».

Рэзолюцыя высоўвае наступныя задачы на бліжэйшае будучае:

«Разгортваньне напружанай барацьбы супроць буржуазнага ўраду і рэакцыйных законаў. Узмацнёная праца на прадпрыемствах і замацаваньне вытворчых ячэек комсамолу.

У галіне профсаюзнай працы—мобілізацыя моладзі для барацьбы за паляпшэньне яе становішча і ўцягненьня моладзі ў агульную барацьбу пролетарыяту».

Агульная барацьба, адзіны вораг.

Дзесятая гадавіна Кастрычніка—сьвята не толькі працоўных СССР.

Гэта сьвята сусьветнага пролетарыяту усіх працоўных, усіх прыгнечаных.

Падрыхтоўка да гэтага сьвята ідзе ўсюды, дзе ёсьць сапраўдныя сябры СССР.

У першую чаргу, працоўныя ўсіх краін організуюць рабочыя дэлегацыі.

Ужо выяжджаюць дэлегацыі: Паўночнай Амэрыкі, Бэльгіі, Англіі, Нямеччыны, Францыі, Фінляндыі, Норвэгіі, Швэцыі, Чэха-Славакіі, Ірляндыі, Швайцарыі, Латвіі.

Апрача таго, ёсьць паведамленьні аб прыездзе дэлегацый Аргэнтыны, Бразыліі і шэрагу іншых краін Эўропы і Азіі.

Акрамя гэтых дэлегацый у СССР накіроўваюцца дэлегацыі моладзі, сялян вучоных.

Першыя ластаўкі ўжо зьявіліся.

Заўчора прыехала аўстрыйская рабочая дэлегацыя.

Дванаццаць пролетарыяў аб адным гаварылі з пролетарыямі Масквы.

«У нас агульная барацьба, з адзіным ворагам»,—так сказаў т. Герман—старшыня дэлегацыі.

Пролетарыят усяго сьвету хоча пераканацца і сваімі вачыма ўбачыць, як вольнымі рукамі будуюць соцыялізм працоўныя СССР.

У нас крок за крокам новыя дасягненьні. У маніфэсьце ЦВК СССР да ўсіх працоўных, разам з іншымі пастановамі, ёсьць пастанова аб увядзеньні ў бліжэйшыя гады 7-мігадзіннага рабочага дню без паменшэньня заробку адносна вытворчых рабочых.

У той час, як у буржуазных краінах ідзе павялічэньне рабочага дню і паменшэньне заробку.

Усё гэта пабачаць, у ва ўсім гэтым упэўняцца пролетары ўсяго сьвету, калі прыедуць да нас.

З свайго боку, мы з вялікай шчырасьцю будзем іх сустракаць.

Алёнін.

Ухарош вуліцу і хату.

ДА КАСТРЫЧНІКА ЗАСТАЛОСЯ 18 ДЗЁН.

СКАРЫСТАЙЦЕ ЯКІ ЗАСТАЎСЯ ЧАС ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ.

Засьвецiць электрыка.

(Аршанская акруга)

Мсьціслаўскі раён рыхтуе да выданьня бюлетэнь: **«Дасягненьні раёну за 10 год.**

У хатах-чытальнях, пэдтэхнікуме і дзіцячым гарадку адбудуцца вытворчыя выстаўкі.

Будзе організавана некалькі **стралковых гурткоў, адчынена 3 адрамантаваныя школы і адна новая, адбудзецца ўрачыстае адчыненьне пабудаванага дому пад сельсавет, распачне працу сельска-гаспадарчы музэй і млын раённага КСУ.**

Сельска-гаспадарчяя коопэрацыя ў гэты дзэнь адлічыць на справу коопэраваньня беднаты і батракоў 100 руб.

У Дубровенскім раёне ў гэты час **адбудзецца адчыненьне сельска-гаспадарчага складу і часовай Асінаўскай станцыі.**

Абноўленае мястэчка.

Толькі манастыр напамінае пра былое Бялыніч.

(Мястэчка Бялынічы, Магілеўская акруга).

Да Кастрычніка мястэчка Бялынічы было самым цёмным кутком на Беларусі.

У мястэчку была толькі адна царкоўная школа, у якой вучні атрымлівалі веды толькі аб жыцьці бога і яго сына Ісуса.

Большасьць сялян-беднякоў і батракоў, якім было вельмі цяжка жыць, ішлі ў манастыр у манахі.

Пажылыя жыхары мястэчка ніколі не забудуць факту, калі пан былога маёнтку зьдзекваўся над людзьмі. Быў выпадак, калі зьбітае сялянства жандармамі і ўраднікамі ня вытрымала і пайшло вызваляць арыштаванага селяніна. Яго арыштавалі за тое, што ён ня зьняў шапку перад становым. Больш маладзейшыя мужчыны пабралі сякеры, драбавікі, вілы і пайшлі ламацца ў дзьверы, дзе сядзеў гэты самы селянін. Тады быў дадзен загад—страляць па бунтаўшчыкох. Шмат было забіта і паранена.

Комсамольская організацыя ў Бялынічах організавалася яшчэ ў 1920 годзе. Ёй прышлося шмат папрацаваць як над аховаю мястэчка ад бандытаў, а таксама па выкрыцьці ворагаў саветаў, контрабандыстаў і спэкулянтаў.

І цяпер мястэчка ажыло, перамяніла сваю вопратку. На плошчы стаіць новы, збудаваны самім сялянствам, коопэратыў-ны будынак, ля якога кожны дзень зьбіраецца шмат народу, каб купіць патрэбную рэч і пагутарыць пра навіны. Так-сама распрацован плян **пабудаваньня яшчэ двух сямігодак у мястэчку,** якія будуць працаваць на нацыянальных мовах. Рыхтуецца да пабудоўкі **электра-станцыя на рацэ Друці.** Ёсьць тэатр, вардом, дзе моладзь у вольны час чытае газэты і атрымлівае справкі па розных пытаньнях.

У 1924 годзе, па пачыне комсамольцаў, організаваўся яўрэйскі колектыў **«Новы шлях»,** дзе гаспадарка пастаўлена па-новаму, культурнаму, якая служыць прыкладам сялянству.

Глядзім на абноўленае мястэчка, якое вясёлкай выглядае на ўзгорку, кінеш вокам на заспаны манастыр і з больлю на душы ўспомніш мінулае Бялыніч.

А. І. Завіляй.

Прыпеўкі вольнай дзяўчыны.

Эй, гармонік, мой гармонік,
Мне пацеха над табой.
—У комсамол ідзі дачушка,—
Кажа гэтак бацька мой.
У зялёненьнім садочку
П'яе, сьвішча салавей.
Мамка ў клюб мяне пусьціла,—
Майму сэрцу весялей.
Разудалы мой Мікіта,
Паплыві ты за вадой.
Я на вуліцы сьпявала
З комсамольскай грамадой.

На зялёненькім дубочку
Ветачка схілілася.
У комсамол я паступіла,
Чытаць навучылася.
Не магу я наглядзецца
На свайго Амельку,
Як ён трактарам арэ
Чорную зямельку.
За ракой сабачка брэша,
На ім шэрсьць кудлатая.
Комсамолка Гэлечка—
Працаўнік заўзятая.

Падарункі Кастрычніку сабе на карысьць.

(Валынецкі раён, Полацкая акруга).

У вёсцы **Барсукі,** Валынецкага сельсавету, будзе організавана машыннае таварыства, а таксама тры вёскі пераводзяцца на шматпольле. Утвараецца шавецкая майстэрня.

Сіламі **сялян Галубоўскага** сельсавету **будуецца мост праз раку Свольна.**

У **Боркавіцкім** сельсавеце **будзе адчынена чарапічная майстэрня, адбудзецца закладка будынку пад клюб.**

У **Дзернавіцкім** сельсавеце організоўваецца добраахвотная пажарная дружына, а пры ячэйцы ТСА-авіяхіму пачне працаваць стралковы цір.

Праведзена падрыхтоўка да адчыненьня машыннага таварыства у **Прудзінкаўцах.** Тут-жа будзе адчынена школа і організавана ячэйка ТСА-авіяхіму.

Не забудзем барацьбітоў.

(Мястэчка Дукора, Меншчына).

Як толькі выедзеш з Дукоры, адразу кідаецца ў вочы сваімі пажаўцелымі лісьцямі парк. Гэта былшы панскі маёнтак. Сярод гэтых вялізарных дрэў блішчыць вялізарны каменны будынак. Гэта школа імя «16-ці партызан», адбудаваная ў гэтым годзе з развалены панскіх палацаў. За некалькі крокаў ад школы высіцца двухпавярховая будыніна. Гэта інтэрнат. Ён пабудован, як помнік загінулым у гэтым маёнтку падпольнікам у часе белапольскай окупацыі.

Цяпер вучні дукорскай дзевяцігодкі старанна рыхтуюцца да правядзеньня 10-й гадавіны Кастрычніка, падрыхтаваліся ўжо для выхаду ў суседнія вёскі на сьвята.

Наста Каляда.

ЗБОРАЎЦЫ ПРЫКЛАД ІНШЫМ

У адным з апошніх нумароў «Чырвонай Зьмены» мы пісалі аб тым, як «папяровыя балоты» пастаноў, плянаў, цыркуляраў хаваюць жывую працу ячэек.

Вопыт працы Збораўскай ячэйкі вучыць, як весьці жывую, карысную працу. — У часе перавыбараў бюро ячэек, вызначэньня далейшых плянаў працы,—возьмем прыклад са Збораўскай.

(Рагачэўскі раён, Бабруйшчына).

Зборава—вёска з 200 двароў. Ёсьць тут і шмат моладзі, але зараз у комсамольскай ячэйцы толькі 9 чалавек. Ёсьць ў вёсцы двухкамплектная школа з двума настаўнікамі, сельсавет, КСУ і організаванае ячэйкай аддзяленьне спажывецкай коопэрацыі. Прычым, праўда, уся «ўлада» ў гэтых організацыях належыць цалкам вось гэтым 9 комсамольцам.

Як кожную вёску, Зборава ня мінаў «чырвоны певень». Ячэйка організавала пажарную дружыну. Гэта была яе першая работа.

«Чырвоны певень» у руках комсамольскіх.

Организаваўшы, і купіўшы машыну, (насос), трэ' было дружыну замацоўваць і пашыраць. Сяляне, падтрымаўшы ячэйку пры організацыі, не хацелі дапамагаць ёй у далейшай рабоце. І вось тут ячэйка паказала сваю організаванасьць. Даканала абгаварыўшы пытаньне ў сябе на бюро і сходзе, потым на прэзыдыуме сельсавету, ячэйка паказала на сходзе сялянам практычныя шляхі. Сяляне згадзіліся. У выніку прадаўшы грамадзкія дубы—адзіночкі, якія стаялі на сенажаці без карысьці і сабраўшы яшчэ крыху сродкаў цэлай вёскай пабудавалі пажарны хлеў, купілі яшчэ машыну, прывялі ў парадак двор, навэрбавалі разам з комсамольцамі 35 чалавек пажарнікаў. І цяпер ячэйка сочыць за работай комсамольцаў пажарнікаў: «Заслухаўшы даклад комсамольца — начальніка пажарнай дружыны Ерахава, агульны сход ячэйкі ўхваліў... **„Не паслабляць работы ў зьвязку з летнім пэрыодам. Сачыць за дзяжурствам усяго насельніцтва. Бюро дружыны скласьці расклад варты вёскі, уцягнуць у працу ўсіх пажарнікаў, склаўшы плян працы. Сачыць за ачысткай комінаў і за тым, каб былі драбіны і вада каля кожнай хаты. Старацца і далей пашыраць інвэнтар, наладзіўшы лепшы догляд за цяперашнім, абзавесьціся чарпакамі. Сачыць за лясными пажарамі“.**

Пастанова ячэйкі яскрава гаворыць аб тым, што ячэйка навучылася добра кіраваць работай комсамольцаў.

Ячэйка ня прымае пытаньня „да ведама“.

Пачалі з дробязяў.

Організаваць коопэратыўную краму трэба было да зарэзу, бо сяляне за ўсякай дробязьзю ехалі за 10 верст у горад. Дагаварыліся комсамольцы з праўленьнем коопэратыву. Далі згоду. І вось для ўсякай дробязі, «табаку, мыла, шыла» і інш. неабходных рэчаў адчынілі коопэратыўную краму. З дробязяў пачалі „гандляваць“. А цяпер ёсьць у іх тавары і буйнейшыя. Склалі крамную камісію, зьнізілі цэны. Было раней 20 пайшчыкаў,—зараз 170 (85 проц. усіх двароў вёскі коопэравалі). За гэта лета ўцягнулі больш 50 чалавек, з іх 25 беднякоў.

Агітавалі і словам і справай індывідуальна і на сходах. Нехапаючыя тавары, (напрыклад, муку вясною) адпускалі ў першую чаргу пайшчыкам. Прыкмецілі комсамольцы, што коопэратар Анісаў крыху качае ў працы (водпуск ў крэдыт, асабліва гарэлкі, п'янка у краме і інш) заслухалі яго даклад на ячэйцы, адзначылі: «... **Прапануем спыніць зараз-жа п'янку ў краме, у тым ліку і „ў самаго сябе“ забараніць водпуск тавараў у крэдыт, а таксама і прадажу на прыватнай кватэры. Зачыняць краму толькі ў адзначаны дзень. Увесьці гігіену ў краме, акуратна чысьціць вагу, праветрываць тавары, акуратна вывешваць расцэнку і да расцэнкі не прадаваць тавараў. Трымаць больш цесную сувязь з крамнай камісіяй і сельсаветам. Павінны быць самыя лепшыя адносіны з насельніцтвам. Больш энэргіі ў рабоце. Праверыць выкананьне тав. Анісавым пастановы сходаў праз месяц».**

Заўвагі з боку непатрэбны. Тут трэба спыніцца на другім. Хто ведае ўмовы прыгарадных вёсак, той скажа, што тут цяжка організоўваць спажывецкую коопэрацыю, бо сялян такіх вёсак больш цікавіць гарадзкі рынак, а ў «гарадзкой коопэрацыі больш тавараў і таньней». І ўсё-ж такі комсамольцы організавалі справу, пачалі з дробязяў, а ў гэтым і ўся навука. Цяпер комсамольцы думаюць організоўваць вытворчае таварыства, толькі дрэнна, што адкладаюць да выхаду вёскі на пасёлкі.

Не адстаём ад «сёньнешняга дню».

Вёска вялікая, а трохпалёўка і церазпалосіца перашкаджае весьці працу па сельскай гаспадарцы. Па пляну, вёска павінна быць земляўпарадкавана толькі ў наступным годзе. Але ячэйка не чакае. Яна організована праводзіць пасеўную кампанію: здабывае насеньне для беднякоў і серадпякоў у крэдыт і за грошы, прывозіць машыну для ачысткі, сартыроўкі сялянскага насеньня, заводзіць раньні папар ворыва на зіму. Акрамя ўвядзеньня на полі пасеву розных культур і ўгнаеньняў, комсамольцы чысьцяць хлявы, паляпшаюць корм жывёлы. У працы трымаюць сувязь з аграномам.

Ячэйка не качае і ў культурна-масавай рабоце. Пасьля акруговага і раённага конкурсу гарманістых і плясуноў, ячэйка організавала ў сябе шумавы орькестр, пачала праводзіць комсамольскія вячоркі, вечары самадзейнасьці, ажывіла дні сялянскай моладзі.

Дзейнасьць ячэйкі не абмяжоўваецца толькі гэтымі конкрэтнымі справамі. У практычных, каляндарных плянах ячэйкі ёсьць шмат пунктаў і аб іншых работах, якія праводзяцца таксама жыва, па новаму. **Самае характэрнае і грунтоўнае ў гэтай ячэйцы тое, што яна ў сваёй рабоце не адстае ад задач сёньнешняга дню. Мы бачым, што гаспадарчая работа займае ў ёй галоўнае месца. Ажыўляецца культурна-масавая работа. І гэта посьпех. А для таго, каб работа прынесла карысьць, ячэйка навакол яе змагла аб'яднаць масы, належныя сілы, змагла добра да кожнай работы падрыхтавацца, знайсьці жывую форму правядзеньня, давесьці работу да канца.**

Будзем вучыцца працаваць ад гэтай ячэйкі. У перавыбарную кампанію бюро ячэек, пры складаньні плянаў работы, возьмем з яе прыклад.

П. Пячонка.



Навучымся кіраваць работай!

(Вынікі пленуму ЦК ЛКСМБ).

Толькі што адбыўшыся пленум ЦК ЛКСМБ апрацаваў пытаньне аб выкананьні дырэктыў па ўнутры-саюзным кіраўніцтве.

Вырашэньне задач, пастаўленых перад комсамолам XIV зьездам УсеКП і IX зьездам КП(б)Б, а таксама VII зьездам УсеЛКСМ і ўмовы работы ЛКСМБ патрабуюць асаблівай увагі пытаньню ажыўленьня саюзнае работы, пытаньню кіраўніцтва работай. Апошні пленум ЦК меў магчымасьць ужо падвесьці некаторыя вынікі гэтай работы.

У выніку выкананьня дырэктыў аб ўнутры-саюзным кіраўніцтве ў рабоце організацыі маецца шэраг дасягненьняў. У горадзе ажыўленьне работы ідзе ў першую чаргу па лініі большага ўдзелу ячэек і асабліва асобных комсамольцаў у жыцьці прадпрыёмстваў. Мы маем сярод комсамольцаў і сярод беспартыйнай рабочай моладзі узмацненьне вытворчае дысцыпліны, і як вынік гэтага, амаль поўнае зьнішчэньне сярод моладзі беспрычынных прагулаў. Мы наглядаем зараз больш шырокі і больш дзелавы ўдзел комсамольцаў у рабоце вытворчых нарад і камісій, дзе комсамольцы на аснове вывучэньня жыцьця прадпрыемства ўносяць шэраг практычных прапаноў. Больш як раней наладжана работа комсамольскіх ячэек з спэцыялістамі. Шырэй разгортваецца і паляпшаецца якасная работа па вытворчай адукацыі і вытворчым выхаваньні рабочай моладзі (мы не гаворым аб форме навучаньня праз ФЗВ, профтэхшколы і інш.) Камітэты і ячэйкі падышлі бліжэй да практычнага кіраўніцтва работай ячэек і комсамольцаў на прадпрыемствах.

Калі гавораць аб вёсцы, дык тут трэба адзначыць усё разгортваючыся шырэй і шырэй удзел комсамольскіх ячэек у гаспадарчым і грамадзкім жыцьці, удзел у практычных мерапрыемствах партыі, гаспадарчых і савецкіх органаў, па разьвіцьці і коопэраваньні сельскае гаспадаркі. На старонках нашае газэты мы маглі чытаць аб шэрагу фактаў ініцыятывы комсамольскіх ячэек у правядзеньні земляўпарадкаваньня, у мэліарацыйных работах, у правядзеньні пасяўных кампаній, аб шэрагу фактаў агрыкультурных пачынаньняў комсамольцаў у сваіх гаспадарках, аб ініцыятыве комсамольцаў у разьвіцьці відаў с-г. коопэрацыі. Бліжэй прыцягнуты да с-гасп. работы комсамольцаў, агрономічныя і культурныя сілы вёскі.

Вядома, што вышэй пералічаным далёка ня вычэрпваюцца дасягненьні ЛКСМБ ў галіне кіраўніцтва і ажыўленьні саюзнае работы. Можна адзначыць шэраг і другіх дасягненьняў: значнае высоўваньне новага актыву з рабочых і сялян, посьпехі ў разгортваньні ўнутры-саюзнае дэмократыі, пасіленьне жывога кіраўніцтва замест кіраўніцтва абежнікамі, большая плянавасьць у рабоце і г. д. Але пленум ЦК ацэньвае ўсе гэтыя дасягненьні толькі як пачатак у ажыўленьні работы і палепшаньні саюзнага кіраўніцтва.

Якія-ж задачы стаяць перад ЛКСМБ у справе палепшаньня ўнутрысаюзнага кіраўніцтва надалей?

У лістападзе 1926 г. III пленум ЦК УсеЛКСМ прапрацаваў пытаньне «аб палепшаньні форм і мэтадаў саюзнага кіраўніцтва і правядзеньні унутры-комсамольскае дэмократыі» і прыняў па гэтым пытаньні шэраг практычных пастаноў. На сёньнешні дзень Пленум ЦКЛКСМБ мог адзначыць шэраг дасягненьняў у правядзеньні гэтых пастаноў у жыцьцё, але ўсё-ж і надалей галоўнай нашай задачай, побач з выжываньнем маючыхся недахватаў, зьяўляецца работа па ажыцьцяўленьні пастаноў III пленуму.

Акрамя гэтага, перад ЛКСМБ стаіць шэраг другіх задач.

Ва ўсякай рабоце вялікую ролю адыгрывае скарыстаньне маючагася ўжо вопыту, але для таго, каб яго скарыстаць трэба раней вопыт сабраць. У нас асобныя раёны і ячэйкі маюць добры вопыт работы, але ў нас да гэтага часу зусім слаба пастаўлена работа па зьбіраньні, вывучэньні гэтага вопыту і распаўсюджваньні яго на другія організацыі, раёны, ячэйкі. Выявіцца ў ячэйцы новае што ў рабоце, новая практычная форма, а другія ячэйкі аб гэтым ня ведаюць і ня могуць гэтае добрае формы прымяніць. Ёсьць у нас інструктарскія групы. У некаторых акругах яны змаглі наладзіць сваю работу і аказваюць РК вельмі значную дапамогу, а ў некаторых акругах ня ведаюць, як і што ім рабіць, ці дрэнна падабраны па складу і ня ўмеючы наладзіць работы, адміраюць. З-за таго, што адна організацыя не перадала вопыту работы сваіх інструктарскіх груп, другія ня могуць гэтае добрае формы работы скарыстаць.

Адсюль перад намі паўстае задача сыстэматычнай работы па зьбіраньні, вывучэньні і распаўсюджваньні на ўсю організацыю лепшага свайго вопыту. РК і АК карысна завесьці сшыткі вопыту работы, ячэйкі павінны паведамляць аб сваім вопыце праз старонкі «Ч. З».

У рабоце ячэйкі і камітэту вельмі многа знача добры плян. А ў нас, трэба адзначыць, ёсьць яшчэ няўменьне складаць пляны. Нашы ячэйкі, ды і РК яшчэ часта пішуць агульныя пункты, такзваныя, вечныя пункты, годныя для «всех времен и всех народов», як «весьці работу сярод беспартыйнай сялянскай моладзі», ці «прыняць удзел у коопэраваньні сялянства». Гэта піша вясковая ячэйка, а якую работу весьці—ня піша, а трэба імённа ў пляне вызначыць, пералічыць работы, якія за азначаны пэрыод часу думае ячэйка ці РК зрабіць. І павінна быць запісана ні наогул, «весьці работу» «прымаць» удзел, гэта напісаць вельмі лёгка, а што зрабіць, напрыклад: «абглядзець работу комсамольца прыказчыка коопэратыву», «праверыць, што зрабіў комсамолец у сваёй гаспадарцы па заданьні ячэйкі», «вывучыць і падрыхтаваць на ячэйцы да вытворчай нарады пытаньне аб патрэбнай колькасьці нафты для рухавіка, даручыць гэта такім таварышом» і г. д. Бяручы для работы некалькі пытаньняў, трэба строга вызначаць тэрміны выкананьня работы і каму даручаецца рабіць (камітэту, ячэйцы, асобным комсамольцам і г. д.). Гэта дасьць магчымасьць лепш праверыць работу. Абавязак сакратара ячэйкі, ці камітэту дакладваць сходу, пленуму, якія пастановы, заданьні, калі і як выкананы.

Трэба вызначаемыя ў плянах работы увязваць з вытворчымі і гаспадарчымі плянамі свайго заводу, с-савету, коопэрацыі, РВК і інш., гаспадарчых і савецкіх устаноў, каб не здарылася таго, што с-савет ці коопэрацыя працуе над коопэраваньнем беднаты, а мы рамантуем дарогі. Увязка плянавых работ дасьць нам магчымасьць больш прыцягнуць у дапамогу нашай рабоце гаспадарчыя, сав. і інш. ўстановы і з другога боку магчымасьць нашай організаванай дапамогі ім у выкананьні іхняй работы.

(*Працяг будзе*).

П Галавач.

...А ПА СУТНАСЬЦІ—ЗЬДЗЕК.

Мы зноў паведамляем аб фактах бюрократызму.

Ня спынім барацьбы з казёншчынай і цяганінай!

Крыху аб руках.

Нам прыходзіцца ня першы раз пісаць пра Менскі акруговы аддзел комунальнай гаспадаркі, у якога часта левая рука ня ведае, што робіць правая.

Калі рабочаму абутковай фабрыкі т. **Шэйнбэргу** трэ' было зрабіць у сваёй кватэры на Іванаўскай вуліцы, № 10 некаторы рамонт, ён зьвярнуўся ў комгас з просьбай аб дазволе зрабіць яго за свой кошт.

Працаўнік комгасу тав. Клімаў чорным па беламу напісаў такую адносіну загадчыку дамамі: „Рамонт дазваляецца, падцьвердзьце яго выкананьне і кошт".

Атрымаўшы, такім чынам, згоду комгасу, тав. **Шэйнбэрг** за свой кошт зрабіў у кватэры адпаведны рамонт: уставіў новыя рамы, шыбы ды інш., (аб гэтым маюцца адпаведныя квітанцыі і расьпіскі рабочых).

Здавалася-б, што цяпер **Шэйнбэрг** мае права за зроблены ім рамонт быць на некаторы час вызваленым ад кватэрнай платы на суму, роўную грашам, затрачаным на рамонт, але вышла наадварот. У адзін з прыгожых дзён ад комгасу прыбывае адносіна з неразборчывым подпісам, што рамонт ня можа быць залічаны ў лік кватэрнай платы, як зроблены без дазволу комгасу(!).

Такім чынам „правая рука" абвясьціла несапраўным дазвол, дадзены на рамонт „левай рукой" і патрабуе ад рабочага кватэрную плату, ня лічачыся са зробленым рамонтам і сродкамі, патрачанымі на яго.

У дадатак, кіраўнік дамамі комгасу пастанаўляе прадаць з таргоў памянёны дом і прапануе яго купіць самому Шэйнбэргу, за што просіць звыш 500 рублёў.

І гэта пры 60-цірублёвай пэнсіі, атрымліваемай Шэйнбэргам на абутковай фабрыцы!

З.



«Шышка», якіх многа.

Дзе „засела" справа?

(Старобінскі раён, Бабруйскай акругі).

Увосень 1925 году сяляне-бедныя вёсак Дубей, Чырвонадворцы і м. Старобіна арцельлю працавалі па ачыстцы ракі Ўдавы (каля м. Семежава, Бабруйскай акругі).

Кіраваў гэтымі работамі нейкі прыватны падрадчык УРМАН.

Прарабіўшы некаторы час, арцель зьвярнулася да яго за атрыманьнем свайго заробку. А заробленa было 630 рублёў.

Адказваў Урман коратка: — Пачакайце крыху, бо цяпер няма грошай.

І сяляне чакалі.

Потым Урман кудысьці паехаў і больш не вярнуўся. Кажуць, што яго пасадзілі ў справіцельны дом.

Ня ведаючы—куды дзяваўся падрадчык, справу аб неатрыманых грошах арцель перадала ў мэліорацыйны аддзел Наркамзему.

Пабываўшы некалькі разоў у Менску, арцельшчыкі дабіліся таго, што іх паперы 15 лютага гэтага году, за № 3т/3479 былі перасланы Слуцкаму акрзямаддзелу, дзе і... прапалі.

Акруга зараз зьліквідавана, і дзе „засела" справа, якая цягнулася 2 гады,- невядома.

А грошай сяляне так і не атрымалі.

СУМАР.

Літара і комсамолец.

Гэта было ў сераду, 12-га кастрычніка.

Рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена" трэ' было зацьвердзіць у ЦВК проэкт пастановы аб комсамольскіх суботніках. З гэтай мэтай супрацоўнік рэдакцыі зьвярнуўся да супрацоўніка канцэлярыі ЦВК комсамольца Ігнаценкі, каб ён даў адпаведны ход проэкту.

Комсамолец Ігнаценка доўга разглядаў паперу і, урэшце, сказаў:

У слове „зьяўляючыхся" няправільна стаіць адна літара, яе трэба замяніць. А тут —коска не на месцы... А тут...

Дзьве гадзіны тав. Ігнаценка затрымліваў супрацоўніка рэдакцыі. Замест таго, каб самому ўнесьці дробныя, нязначныя папраўкі, ён прапанаваў пайсьці назад у рэдакцыю і нанава перадрукаваць проэкт пастановы.

А калі супрацоўнік папрасіў дазволу ў тав. Ігнаценкі перадрукаваць проэкт у канцэлярыі ЦВК, бо часу было мала, апошні заявіў, што „машыністка занята"...

Прышлося папрасіць самому. Аказалася, што машыністка была вольная і проэкт перадрукавала.

Толькі пасьля 2 з пал. гадзін бясcэнсавай нікчэмнай цыганіны, тав. Ігнаценка панёс проэкт на подпіс тав. ЧАРВЯКОВУ.

Ці памятае тав. Ігнаценка такую простую рэч, што комсамолец павінен быць комсамольцам ня толькі на сходах ячэйкі, але і на кожным кроку сваёй дзейнасьці?

„Вылеціш з комсамолу".

(Вёска Грабёнка, Чэрвеньскага раёну).

Яшчэ ў 1924 годзе **Захарэвіч Оля** уступіла ў комсамол. Усе яе сёстры і браты былі на актыўнай комсамольскай ці партыйнай рабоце.

Была яна адна на сваёй гаспадарцы: больш рабочых рук ня было. Цэлы дзень на полі жне, пасе сьвіней, ня было вольнай хвілінкі пачытаць. А тут яшчэ нагрузку далі вялікую: павадыр атраду, сябра бюро ячэйкі. Цяжка малапісьменнай, занятай на гаспадарцы дзяўчыне спраўляцца з няпрывычнай працай. Бацька нават ня пушчаў на збо атрадаў. Прасіла яна сакратара ячэйкі крыху разгрузіць, «бо цяжка нават слова са словам зьвязаць, такая някультурная», але пачуліся пагрозы:

— Вылеціш з комсамолу!

Хутка Оля падала заяву аб выхадзе з комсамолу.

Часта мы на пасяджэньнях ня бачым жывых людзей. Мы не адносімся чула, не падтрымліваем таварыша ў цяжкія хвіліны яго жыцьця. Пры нагрузцы мы ня ўлічваем ня толькі жаданьняў комсамольцаў, але і тое, ці справіцца з ёй даны таварыш. І дзякуючы такім бюрократычным адносінам, добрыя комсамольцы часта сходзяць з вашага шляху.

З. К.

Ведай гісторыю Кастрычніка.

10 год назад.

16, 17 і 18 кастрычніка.

З гэтага нумару ў „Чырвонай Зьмене" пачынае рэгулярна друкавацца **каляндарны летапіс кастрычнікавых падзей 1917 г., як у агульна-расійскім маштабе, гэтак і ў беларускім.**

Для разуменьня календара падзей (які пачынаецца намі з 16 кастрычніка) мы лічым неабходным каротка пазнаёміць чытачоў з папярэднімі падзеямі, што мелі месца для гэтага тэрміну, роўна 10 гадоў назад.

* * *

Гэта былі дні напружанага крызісу і канчатковай дыскрэдытацыі (згуба аўтарытэту) у вачох мас часовага („коаліцыйнага") ураду Керанскага, ураду, які ўсімі спосабамі змагаўся з новым рухам, накіроўваемым бальшавікамі. Адбываецца суровы паход і шалёная кампанія супроць саветаў, бальшавіцкіх дзеячоў і рэволюцыйных газэт, якія спачуваюць ім.

Цэнтральны орган нашай партыі „Правда", перажыўшы шмат разгромаў і адміністрацыйных прасьледваньняў, прымушаны мяняць сваю назву, каб хоць кароткі час легальна праіснаваць. У дні, аб якіх ідзе гутарка, ЦО меў назву „Рабочий Путь"

16 і 17 кастрычніка ў „Рабочем Пути" друкуюцца артыкулы т. **Сталіна** „Заговор против революции", якія дакладна абмаляваўшы перад масамі існуючае становішча і выкрываючы сапраўдныя мэты коаліцыйнага ўраду—заснаваньне буржуазнай дыктатуры,—рубам ставяць пытаньне: **што рабіць далей?**

З аднаго боку мы маем саветы, якія стаяць на чале рэволюцыі, на чале барацьбы з контр-рэволюцыяй, што хаваецца за сьпіною ўраду. З другога боку—згодніцкі ўрад Керанскага, які абараняе контр-рэволюцыянэраў, змагаецца з саветамі.

Зараз усё пытаньне заключаецца ў тым, **хто пераможа ў гэтай барацьбе.** Альбо ўлада саветаў—перамога рэволюцыі і доўгачаканы м р, альбо перамога ўраду Керанскага—тады перамога контр-рэволюцыі і вайна „да пераможнага канца" (чытай, да канчатковага зруйнаваньня Расіі)—піша тав. **Сталін.**

* * *

16-га кастрычніка 1917 году зачынілася **Віцебская губпартконфэрэнцыя** бальшавікоў, якая прадстаўляла пяць тысяч арганізаваных членаў партыі. Конфэрэнцыя заслухала даклады з месц і вызначыла сьпіс кандыдатаў на ўстаноўчы збор з Віцебску. Сярод маючыхся ў сьпісе кандыдатаў—прозьвішчы таварышоў **Дзяржынскага, Л. Б. Каменева і г. д.**

18-га кастрычніка адчынілася другая паўночна-заходняя абласная конфэрэнцыя РСДРП (бальшавікоў), якая адыграла вялікую ролю ў падрыхтоўцы Кастрычніка на Беларусі. Конфэрэнцыя пастанавіла сконцэнтраваць на заходнім фронце моцныя ўзброеныя сілы, для надыходзячай барацьбы за ўладу саветаў.

Да таго часу па Менскай, Віцебскай, Магілеўскай губэрнях і па ўсім Зах. фронце наогул налічвалася 25 тысяч членаў партыі і 32 тысячы спачуваючых ім.



„Апраметная".

(На грамадзкім праглядзе п'есы БДТ—2).

Першы спэктакль 2-га Белдзяржтэатру адразу-ж пакінуў далёка ня дрэннае ўражаньне.

Невядома толькі, чаму для адчыненьня тэатральнага сэзону БДТ-2 выбраў драматычную казку Шашалевіча „Апраметная". Гэта п'еса з боку зьместу ніякай вартасьці не прадстаўляе.

Апраметная—гэта ў дакладным тлумачэньні значыць—падземнае царства. Упершыню такое вызначэньне падземнаму царству даў Янка Купала.

П'еса паказвае змаганьне цёмных сіл (ведзьмы, чэрці) і беларускіх сялян. Гэта davoлі ўдалая апрацоўка шматлікіх беларускіх казак.

П'еса ўжо ішла яшчэ ў часе працы тэатру ў Маскве. Але аўдыторыяй яна была спаткана няпрыветліва, таму была зьнята з рэпэртуару, ня ішла ў мінулым сэзоне ў Віцебску і толькі цяпер, пасьля пераапрацоўкі, зноў Белдзяржтэатр вынес яе на сцэну. Аднак, і пасьля гэтага, вартасьць самой п'есы не павялічылася.

Аднак, тэатральнае афармленьне тут на вышыні. „Апраметная" пастаўлена паводле апошняга слову сцэнічнае тэхнікі.

Асаблівасьць гульні артыстых 2-га Белдзяржтэатру заключаецца ў тым, што яны— „на ўсе рукі майстры". Яны добра сьпяваюць, танцуюць, спрытныя акрабаты і тонкія артыстыя.

Надзвычайна прыгожа і моцна зроблены дэкорацыі. Павуціньне, якое паказваецца бадай на ўсім працягу п'есы, пераліваецца ў розных тонах асьвятленьня і стварае ўражаньне сапраўднай апраметнай.

Музычныя ілюстрацыі якія дае нябачны сымфонічны оркестр БДТ-2 (кіраўніцтва Гідгарпа), таленавіта дапасоўваюцца да зьместу, да кожнага руху, да кожнага слова артыстых. Часта там, дзе ня могуць стварыць уражаньне словы і крыкі артыстых гэта робіць оркестр. У гэтым яго вялікае значэньне.

Яскравая і пазбаўленая тэатральнага шаблёну гульня асобных артыстых: **Рагавенка** (ведзьмак), **Бандарчык** (Лілея), **Саньнікава** (Янка) і **Ільлінскага** (чорт).

Можна спадзявацца, што малады, поўны сіл і энэргіі, 2-гі Белдзяржтэатр дасьць у гэтым годзе поўнае задавальненьне мастацкім запатрабаваньнем нашага гледача. **Мік. Таў.**

Ад рэдакцыі. Друкуючы рэцэнзію т. Таў, **рэдакцыя просіць нашых чытачоў выказвацца на старонках газэты аб пастаноўках БДТ-2.**

Клюбныя пастаноўкі.

Драмколектыў цэнтральнага партыйнага клюбу імя Карла Маркса прыступіў да рэпэтыцыі вялікай п'есы „Амба" (па раману Е. Чалай). П'есу ставіць артысты 2-га Белдзяржтэатру Саньнікаў.

Расейскі драмгурток клюбу імя КІМ рыхтуе пастаноўку „Константин Терехин".

Новыя фільмы.

Гэтымі днямі Белдзяржкіно выпушчае на Менскія кіно-экраны наступныя кіно-фільмы: грандыёзны фільм «Вар'етэ» (вытворчасьць нямецкага таварыства „УФА"; **„Парыжанка", „Чалавек у ліўрэі", „Кола", „Чужая" („Такая жаночына").**

Куды пайсьці.

Сёньня ў кіно-тэатрах Белдзяржкіно пачынаюць дэмонстравацца наступныя фільмы: „Культура"—вялікі фільм вытворчасьці „Межрабпом-Русь"- **„Чалавек з рэстарану"** (удзельнічаюць—**М. Чэхаў, Каваль-Самборскі і О. Маліноўская**, „Пролетары"—**Дэкабрыстыя**; „Чырвоная Зорка"—**„Смарагда Набурэн".**

У цырку сёньня пачынаюцца гастролі новых артыстых—Собальскага (гумарысты), **Мэры Эльстон** (мёртвая пятля на аўтамабілі), **Шэрлока Холмса** (таемны сундук) і **Гарина** (музыкальны эксцэнтрык).

Заўтра ў памяшканьні Белдзяржтэатру адбудзецца **адна гастроль выканаўцы жанравых народных сьпеваў на 17 мовах—Собінавай.** Кожны сьпеў выканаўцы ідзе пры адпаведных дэкорацыях і касьцюмах.

У нашых школах.

Інтэрнаты для вучняў.

Менакрана пастанавіла арганізаваць новыя інтэрнаты для сялянскіх дзяцей—вучняў сямігодак.

На адчыненьне і абсталяваньне гэтых інтэрнатаў сёлета адпушчана кожнаму раёну па 500 рублёў.

Новыя настаўнікі.

У гэтым годзе школы Менскай акругі папоўніліся новым настаўніцкім пэрсоналам за кошт выпуску ВНУ, тэхнікумаў і інш.

Пэдфак БДУ даў сёлета 34 настаўнікі, пэдтэхнікумы—42, курсы перакваліфікацыі настаўніцтва—32 і вышэйшыя курсы беларусазнаўства—10 настаўнікаў.

Школьнае будаўніцтва.

За апошні час у Меншчыне шырока разгарнулася праца па будаўніцтву новых школ, як за кошт дзяржавы, гэтак і самога насельніцтва.

На дзяржаўныя сродкі будуюцца 22 плянавыя школьныя будынкі і на сродкі сялянства, пры дапамозе органаў Нарасьветы, 86 няплянавых памяшканьняў для школ.

У тры радкі.

○ Закончылася работа па ліквідацыі Зембінскага раёну, Менскай акругі. Ліквідацыя дасьць 25 тысяч рублёў экономіі ў год.

○ У Менску **адчыняецца школа для дэфэктыўных дзяцей у складзе 4 груп.**

○ З 5-га кастрычніка па 1-ае лістапада на Менскай біржы працы адбудзецца **перарэгістрацыя беспрацоўных.**

○ Кампанія ашчаднасьці па Віцебскай акрузе дала **1027 новых укладаў на агульную суму 57.826 рублёў.**

○ Таварыства „ПН" закупіла **на 1500 рублёў падручнікаў** для школ малапісьменных.

○ **Менакрана накіравала сёлета 47 беспрытульных у дзіцячыя дамы і 55—на прадпрыемствы.**

○ На 1927-28 год Наркампрацы закупляе для рабочых і служачых **227 курортных месц.**

○ **Пасяўная плошча ў Менскай акрузе павялічылася,** супроць леташняй, на 13 тысяч дзесяцін.

○ Па БССР існуе **58 добраахвотных пажарных дружын,** якія ахоўваюць ад пажараў найбольш буйныя прадпрыемствы.

○ **На Асінастроі заканчваецца пабудова клюб і інтэрнатаў для рабочых.**

○ У Магілеўскай акрузе пачаўся **месячнік дапамогі беспрытульным дзецям.**

○ **Праз зімовыя дамы адпачынку ў БССР будзе прапушчана сёлета 1500 чалавек**

○ **6 тысяч рабочых-экскурсантаў** наведала нядаўна арганізаваны музэй аховы працы БССР.

„Падпішамся, браток, а?"

Пазыка індустрыялізацыі праходзіць з вялічэзным посьпехам.

На 111 проц. зарплаты.

Падпіска на пазыку індустрыялізацыі на шкляной гуце «**Пролетары**» у поўным распале. Падпіска яшчэ не закончана, а яна ўжо дала 4995 рублёў. З 260 рабочых гуты падпісалася 220 чалавек.

Рабочы **Рамашка**, атрымоўваючы **120 рублёў у месяц,** набыў аблігацыяў пазыкі на **300 рублёў.**

Моладзь не адстае. Шмат хто з комсамольцаў падпісаўся на пазыку індустрыялізацыі на 25 рублёў і звыш.



Тав. Маркейчык.

Асабліва добрую падпіску з ліку моладзі гуты даў **тав. Маркейчык** Аркадзій, 19-цігадовы рабочы «Пролетарыя». Атрымоўвае ён усяго толькі 45 рублёў у месяц, а падпісаўся на пазыку на 50 р., што складае **111 проц. яго зарплаты.**

На вытворчасьці **тав. Маркейчык** працуе з 1925 году. Нядаўна ён падаў заяву аб уступленьні ў комсамол.

Падпісаліся ўсе комсамольцы

Комсамольцы ячэйкі двух харчавых заводаў амаль усе падпісаліся на пазыку індустрыялізацыі. Большасьць з іх набыла 25-цірублёвыя аблігацыі. У сярэднім падпіска складае 15-20 рублёў на комсамольца.

Малады рабочы заводу «Беларусь» тав. **Гутман,** атрымоўваючы 20 рублёў у месяц, падпісаўся на пазыку на 25 рублёў.

Усёй ячэйкай.

Гэтымі днямі на сходзе комсамольскай ячэйкі скурзаводаў была заслухана інформацыя аб значэньні пазыкі індустрыялізацыі.

Падпісацца ўсім комсамольцам—гэткую пастанову вынес сход.

Покуль што падпісалася на пазыку 60 проц. комсамольцаў ячэйкі.

На заводзе „Мэталь".

На 30 проц. сваёй месячнай зарплаты падпісаліся на пазыку індустрыялізацыі рабочыя заводу «Мэталь».

З комсамольцаў падпісалася 50 проц. складу ячэйкі.

Саўхозы сьпяць.

Ніякай растлумачальнай працы аб значэньні пазыкі індустрыялізацыі не праведзена яшчэ ў прыгарадных саўхозах Менсельпрому імя Лекерта і Розы Люксэмбург.

Комсамольская ячэйка **таксама бязьдзейнічае.**



А ты маеш аблігацыю займу?

„Чырвоная Зьмена" дапамагла.

Водгукі на нататкі.

Справа аб нападзе на сакратара комсамольскай ячэйкі. Крымвышук паведамляе, што праведзена дазнаньне па справе хуліганаў **Ліпніцкага і Жыдовіча,** якія абвінавачваюцца ў пакушэньні на жыцьцё сакратара комсамольскай ячэйкі службы цягі МББ чыгункі тав. **Хвядчэні,** аб чым пісалася ў **„Чырвонай Зьмене"** № 102 (484). Устаноўлена, што факты, аб якіх пісалася ў газэце,—праўдзівыя. **Справа перададзена ў нарсуд.**

Аб непарадках у школе сьляпых. Наркамасьветы вылучыў спэцыяльную камісію для абсьледваньня фактаў адносна Менскай школы сьляпых, аб якіх пісалася ў „Чырвонай Зьмене" №№ 85 і 97. Камісіяй устаноўлена, што некаторыя факты не адпавядаюць сапраўднасьці (аб рамонце, аб ізоляцыі вучняў). Але пісалася ў газэце і аб некаторых момантах сапраўднага становішча школы, якое неабходна палепшыць (так, напрыклад, факты няўважлівых адносін да скончыўшых школу сьляпых падцьвердзіліся).

У далейшым камісія лічыць неабходным правесьці шэраг мерапрыемстваў для паляпшэньня жыцьця вучняў і агульнай пастаноўкі школы (псыхо-аналіз, асыгнаваньне сродкаў на рамонт, разгортваньне дзіцячай самадзейнасьці, больш уважлівыя і чулыя адносіны загадчыка да запатрабаваньняў выхаванцаў і інш.).

На хвалі 1155 мэтраў.

(Менская радыё-станцыя імя Савнаркому БССР).

Сёньня перадаецца наступная програма: 5 г. 20 хв.—Даклад—**„Пэрспэктывы электрыфікацыі ў БССР"**; 5.50.—Гутарка з хатнімі гаспадынямі—**„Удзел жанчын у сьвяце Кастрычніка"**; 6.20.—**Радыё-газэта № 180.** 7.00.—Перапынак; 8.00. — **Паверка гадзіньнікаў:** 8.05.—**Трансьляцыя маскоўскіх перадач.**

Заўтра перадаецца: 5.20.—Гутарка ўрача—**„Санітарная асьвета ў БССР"**; 5.50.—Даклад ЦК МОПР'у—**„Аб белым тэроры за межамі"**; 6.20.—**Радыё-газэта № 181;** 7.00.—Перапынак; 8.00.—**Паверка гадзіньнікаў;** 8.05.—**Радыё-газэта на мове эспэранто;** 8.30.—**Трансляцыя маскоўскіх перадач.**

АДКАЗЫ ЧЫТАЧОМ.

Алесю (№ 2012). Прыём у профшколы ўжо даўно скончаны.

Фішбэйну (№ 2013). Саматужнік, які бярэ на працу вучня праз біржу, для гэтага ніякімі льготамі не карыстаецца.

Валюшкінай (№ 1083) Заняткі на праўгасу пачаліся. Калі ты ў анкеце зазначыла, што жадаеш вучыцца на экономічным аддзяленьні, значыць прынята туды.

П. Кароткіну (№ 1225). Калі будзе адбывацца дапрызыўная падрыхтоўка хлапцоў 1906 г. нараджэньня—невядома.

Адказныя рэдактары: { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 1 друкарня БДВ.